**Дзяржаўная установа культуры**
**“Цэнтаралізованая бібліятэчная сістэма г. Гродна”**
**Філіял №9**

# <u>Ала Мікалаеўна Петрушкевіч</u> - пісьменніца, літаратурны крытык, педагог.

**Краязнаўчая бібліяграфічная лістоўка-памятка**

**Гродна, 2014**



У артыкуле, прысвечаным маладым гарадзенскім паэтам, А.М. Петрушкевіч напісала: “Сапраўды - постаці. Значныя, адметныя ў нашай мастацкай гарадзенскай (ніяк не правінцыйнай!) прасторы”. Гэтыя словы можна аднесці і да самой Алы Мікалаеўны Петрушкевіч, пісьменніцы, літаратурнага крытыка, педагога.

Петрушкевіч Ала Мікалаеўна нарадзілась 27 лютага 1960 года ў сям’і селяніна і настаўніцы. Месца нараджэння - вёска Шчонава Карэліцкага раёна. Многа пазней у навуковай працы, прысвечанай мікратапонімам роднай вёскі, Ала Мікалаеўна з горыччу напіша: “Сёння луг ...ператварыўся ў дзікае балота. Зніклі кладкі, што былі насупраць кожнага двара, берагі рэчкі зараслі травой. Разбураны калгасны двор. Сёння ў Шчонаве жывуць 33 чалавекі. У 60-я гады налічвалася 135 жыхароў. Шчонава памірае”. Пачатковую школу Ала Барэйка скончыла ў роднай вёсцы. Затым сям’я пераехала ў вёску Баранавічы Карэліцкага раёна. Вучылася ў васьмігодцы ў вёсцы Машэвічы Карэліцкага раёна. У 1981 годдзе скончыла аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. На працягу васьмі гадоў настаўнічала ў школах Гродзенскай вобласці. З 1989 па 1992 год вучылася ў аспірантуры Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі. З 1992 года выкладае на кафедры беларускай літаратуры Гродзенскага універсітэта, дацэнт.

Друкуецца з 1990 года. Вывучае сучасную беларускую паэзію, беларускую літаратуру пачатку 20 ст., літаратуру беларускага замежжа. Аўтар шэрагу кніг і больш чым 150 навуковых публікацый. У 1997 годзе выйшаў у свет зборнік паэзіі “Пярсцёнак”. Апавяданні А.М. Петрушкевіч з’яўляюцца ў друку.

Была узнагароджана прэміяй Гродзенскага аблвыканкама за творчыя дасягненні ў вобласці літаратуры і мастацтва ў намінацыі “Пісьменнік года” (1999).

1. Пяткевіч, А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: даведнік: [сціслыя біягр. звесткі пра А.М. Петрушкевіч]. - Гродна: ГрДУ. - 2000. - С. 237-238.
2. Петрушкевіч, А. Час пад знакам бэзу: [гутарка з гродзен. паэткай А. Петрушкевіч] / гутар. А. Нікіпорчык // Вечерний Гродно. - 2004. - 7 января. - С. 5.

**Творы А.М. Петрушкевіч**

***Кнігі:***

3. Петрушкевіч, А.М. Іду па слядах: літ.-творчыя артыкулы / А.М. Петрушкевіч. - Гродна, 1997.
4. Петрушкевіч, А.М. Каложа: апавяданне / А.М. Петрушкевіч // Новы замак: літ. альманах. - Гродна. MMXII / укл. С. Астравец. - Мінск: Кнігазбор, 2012. - С. 164-165.
5. Петрушкевіч, А.М. Наталля Арсеннева: шлях да Беларусі: манаграфія / А.М. Петрушкевіч. - Мінск, 2013.
6. Петрушкевіч, А.М. Некаторыя старонкі беларускай літаратуры пачатку 20 стагоддзя: дапаможнік / А.М. Петрушкевіч. - Гродна, 2010.
7. Петрушкевіч, А.М. Пра творы і творцаў: літ.-крытычныя артыкулы / А.М. Петрушкевіч. - Гродна, 2002.
8. Петрушкевіч, А.М. Пярсцёнак: вершы / А.М. Петрушкевіч. - Ліда: Лідская друкарня, 1997. - 64 с.
9. Петрушкевіч, А.М. Сто крокаў па пунсовых кроплях: апавяданне / А.М. Петрушкевіч // Новы замак: літ. альманах. - Гродна. MMXII / укл. С. Астравец. - Мінск: Кнігазбор, 2012. - С. 163-164.

***Артыкулы:***

10. Петрушкевіч, А.М. Гарадзенскія вобразы ў паэзіі Вольгі Іпатавай / А.М. Петрушкевіч // Новы замак: літ. альманах. - Гродна. MMXII / укл. С. Астравец. - Мінск: Кнігазбор, 2012. - С. 185-190.

11. Петрушкевіч, А. “Да жыта лёсам прычыніцца…”: [аб кнізе Голуб Ю. “Зажураны камень”] / А. Петрушкевіч // Галасы, 2: штогоднік. - Гродна, 2003. - С. 210-216.

12. Петрушкевіч, А.М. Ні будзя шчанаўцоў, хай хоць назвы застануцца: мікратапонімы вёскі Шчонава / А.М. Петрушкевіч // Філалагічнае краязнаўства Гродзеншчыны (матэрыялы і даследаванні): зб. навук. арт. (да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка). - Гродна: ЮрСаПринт, - 2012. - С. 113-118.

13. Петрушкевіч, А.М. Пра гарадзенскі клуб паэтаў, або лабірынты прывіднага замка: [аналіз творчасці маладых паэтаў Гродна] / А.М. Петрушкевіч // Маладосць. - 2011. - №6. - С. 95-97.

14. Петрушкевіч, А. “Чэсць аддаць аўторцы…”: да 170-годдзя з дня нараджэння Элізы Ажэшкі / Ала Петрушкевіч // Роднае слова. - 2011. - № 6. - С. 13-17.

Складальнік: Аўдзяевіч В.У.
Рэдактар: Ілюшына І.М.
Адказны за выпуск: Камарова М.А